формы звароту да мастацкага вяшчання, узаемадзейнічаць з замежнымі рэдакцыямі праз удзел у мастацкіх конкурсах, фестывалях і г.д., а таксама вярнуцца да класічнай трохпрыступкавай мадэлі функцыянавання СМІ (інфармаваць – выхоўваць – забаўляць), у якой пазіцыя «выхоўваць» стаіць перад пазіцыяй «забаўляць».


1. Беларусы. Т. 12. Экраннае мастацтва / А. В. Красінскі [і інш.] ; рэдкал.: А. В. Красінскі [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 687 с.
2. Ильченко, С. Н. Эволюция системы жанров отечественного телевидения и ее трансформация в условиях глобализации информационного пространства / С. Н. Ильченко / Автореф. дис. … д-ра филологич. наук, спец. 10.01.10 – журналистика, Санкт-Петербург, лаборат. операт. печати фак-та жур-ки СПб. гос. ун-та, 2011. – 47 с.
3. Кузьмінова, А. Ю. Тэлешоу, ад творчай задумы да рэалізацыі / Ю. А. Кузьмінова ; навук. рэд. В. М. Самусевіч. – Мінск : Медысонт, 2014. – 112 с.
4. Нечай, О. Ф. Экранная культура – трансляция и создание художественных ценностей / О. Ф. Нечай // Экран и культура (Белорусское документальное кино и культура Беларуси) : сб. мат. науч.-практ. конф. (Минск, 27-30 сент. 1999 г.) / Бел. Союз кинематографистов; Мин-во культуры Респ. Беларусь, Нац. академия наук Беларуси ; отв. ред. О. Ф. Нечай – Минск : ЗАО «ТЭКСАРТ». – С. 22–32.
5. Плавник, А. А. Основные этапы развития аудиовизуальных СМИ : учеб.-метод. комплекс для студ. фак. журналистики / А. А. Плавник. – Минск : БГУ, 2003. – 104 с.
6. Трапянок, У. А. Перыяды станаўлення і развіцця тэлетэатра Беларусі: ад першых дзён – да нашага часу / У. А. Трапянок // Культура : открытый формат – 2013 (библиотековедение, библиографоведение, искусствоведение, культурология, музееведение, социокультурная деятельность) : сб. науч. ст. / сост.: Т. Н. Бабич, Ю. А. Переверзева, Е. Н. Шаройко ; Мин-во культуры Респ. Беларусь, Бел. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2013 – С. 264–268.
7. Фральцова, Н. Ц. Тэлевізійны тэатр / Н.Ц. Фральцова // Тэатральная Беларусь : Энцыклапедыя : У 2 т. Т. 2: Лабанок – Яшчур / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2003. – С. 454–457.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВОБРАЗЫ СЯРЭДНЕВЯКОЎЯ ВА ЎСХОДНЕЕЎРАПЕЙСКІМ І БЕЛАРУСКІМ МУЗЫЧНЫМ МАСТАЦТВЕ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ ХХ СТ.


**Трафімчук Т. Ю.**

*кандыдат мастацтвазнаўства, старшы выкладчык кафедры гукарэжысуры*
*Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (г. Мінск)*



***Аннотация.*** *Внимание к образам эпохи Средневековья занимает важное место в художественной культуре второй половины ХХ в. Многие композиторы различных национальных школ также обращаются к духовным ценностям и художественным артефактам прошлого в своем творчестве. Различное по своей природе, оно не только концептуально объединяет определенную группу произведений авторов разных поколений и школ, но и представляет важнейшие универсальные духовные ценности культуры ХХ в.*

***Summary.*** *The attention to the sphere of the Middle Ages occupy an important place in the art culture and of the 20$^{th}$ century. Many composers of different national schools have turned to spiritual values and artistic artifacts of the past in its creativity. Different nature, it do not only conceptually combine a certain group of works by authors from different generations and schools, but also represent the important universal spiritual values in the culture of the 20$^{th}$ century.*

Увага да вобразнага свету і духоўных дамінант эпохі Сярэдневякоўя актуалізавалася ў мастацкай культуры з другой паловы XX ст. Гэта знайшло яркае адлюстраванне ў розных сферах музычнай дзейнасці, у тым ліку і кампазітарскай творчасці. Сачыненні расійскіх, украінскіх, польскіх, літоўскіх і беларускіх аўтараў прадставілі багатую палітру творчых увасабленняў тэмы сярэдневяковай даўніны, дзе пры наяўнасці пэўных паралеляў вылучаецца шэраг адметных асаблівасцей.

Ва ўсходнееўрапейскіх краінах – Расіі, Украіне, Польшчы, Літве - глыбінная сувязь сучаснасці з даўнінай, у цэлым, адчувалася заўсёды. Яе фармавалі і падтрымлівалі культурны ландшафт і помнікі, якія захаваліся з часоў Сярэдневякоўя, пралангацыі старажытных форм і жанраў у царкоўнай традыцыі, навукова-даследчая праца музыказнаўцаў-медыявістаў, акадэмічныя і аматарскія звароты да сярэдневяковых гучанняў (адраджэнне старажытнага інструментарыя, правядзенне аўтэнтычных канцэртаў, стылізаваных перфомансаў, фестываляў).

У Беларусі гістарычныя, ментальныя, ідэалагічныя ўмовы не спрыялі паўнавартаснаму разгорту тэмы сярэдневяковай мінуўшчыны амаль да апошняй трэці XX ст. Той пласт рэлігійна-сакральных вобразаў і княжацка-дзяржаўных матываў, які непазбежна ўздымала «сярэдневяковасць», у аб'ектыўнай сітуацыі «разлому эпох» [3] доўгі час заставаўся незапатрабаваным, нават забароненым. Аднак у музычным мастацтве дыялог са старажытнай эпохай хоць і не быў ярка праяўлены, латэнтна – усе ж захоўваўся. Сведчаннем гэтаму з'яўляюцца даўнія музычныя формы і жанры, якія існуюць у храмавым асяроддзі, таксама адзінкавыя, але паказальныя сцэнічныя творы пешай паловы XX ст. - оперы «Маргер» К. Горскага (1905) і «Усяслаў Чарадзей» М. Шчаглова-Куліковіча (1944).

Інтэнцыі эпохі Сярэдніх вякоў праявілі сябе ў музыцы кампазітараў суседніх краін пераважна праз прызму агульнамастацкай тэндэнцыі новага сакральнага мастацтва (ars sacra). У належных да галіны новай сакральнай музыкі (nova musica sacra) творах розных жанраў, сярод якіх літургія, стыхіра, канон, малітва, меса, рэквіем, літанія, гімн – сучасныя аўтары (Ю. Буцко, Ул. Генін, Г. Дзмітрыеў, А. Каралёў, А. Караманаў, А. Фляркоўскі, В. Палявая, В. Кікта, С. Бядусенка, Б. Сёгін, М. Швед, К. Пендэрэцкі, М. Гансенец, Е. Станковіч, П. Мос, Ф. Нававейскі, Я. Крэнц, К. Дэнбскі, З. Шостак, З. Словік, Р. Твардоўскі, С. Марыта, А. Рэмеса, А. Кучынскас, А. Мальцыс, І. Балакаускас, Д. Ракайтэ-Джэнкайтэнэ, З. Бружайтэ) звярнуліся да важных духоўных каштоўнасцей далёкай эпохі, сутнасцю чаго, паводле заўваг Ул. Мартынава, стала «спроба супрацьстаяць распаду сучаснага свету шляхам стварэння новага культурнага сінтэзу, які здзяйсняецца на перакрыжаванні розных культур і традыцый <…> і пашырае сакральную прастору, якая існуе ў літургіі, за яе межы, што асвячае тыя вобласці часу і прасторы, якія згубілі царкоўнасць» [4].

У беларускай мастацкай культуры дыялог са Сярэдневякоўем «загучаў» з іншым адценнем.

З аднаго боку, у рэаліях сучаснасці запатрабаванай засталася сакральная дамінанта старажытнай эпохі, паводле якой «свет і ўсе яго часткі атрымлівалі асобую маральную афарбоўку» [2, с. 223]. Шчырымі і праніклівымі выразнікамі гэтага кірунку ў музыцы сталі творы, набліжаныя да ўзораў царкоўнай усходне-праваслаўнай або касцёльнай заходне-каталіцкай традыцыі (А. Бандарэнка, Г. Кароткіна, А. Безенсон, Л. Шлег, А. Залётнеў, М. Васючкоў, С. Бельцюкоў).

З другога боку, менавіта гістарызм як такі, што праявіў сябе ў зваротах мастакоў да постацей, топасаў, тэкстаў і падзей далёкай мінуўшчыны, вызначыў той важны напрамак у айчыннай культуры, дзе эпоха Сярэдніх вякоў паўстала



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аксіялагічна важным сімвалам новага нацыянальна-культурнага адраджэння 1970 – 2000-х гг., які сцягнуў вакол сябе сучасныя мастацкія і, нават, грамадскія ўяўленні, разважанні пра беларускі шлях, беларускую гісторыю – пра «тую ідэальную (ідэалізаваную) Беларусь». Найбольш яркімі музычнымі рэпрэзентантамі гэтай плыні з'явіліся праграмныя сімфанічныя і народна-аркестравыя творы айчынных кампазітараў («Каложа» В. Войціка, Пятая («Памяць Зямлі») і Шостая («Полацкіяч пісьмёны») сімфоніі А. Мдзівані, сімфанічная фрэска «Крэва» А. Літвіноўскага, фрэскі для аркестра народных інструментаў «У вянок Ефрасінні Полацкай» і «Сабор святой Сафіі» Г. Ермачэнкава), оперы, кантаты, араторыі, мюзіклы («Князь Наваградскі» А. Бандарэнкі, «Замчышча» Л. Мурашкі, «Сказ пра Ігара» Л. Шлег, «Софья Гальшанская» Ул. Кандрусевіча), балеты («Страсці (Рагнеда)» А. Мдзівані, «Вітаўт» В. Кузняцова), а таксама камерна-інструментальныя і вакальна-інструментальныя сачыненні («Песнапенні пра Ефрасінню Полацкую», Л. Шлег, «Сны Ефрасінні» Л. Сімаковіч, «Званы Сафійскага сабора» В. Гаркушы, «Старажытны Полацк» і «Сафійскі сабор» Г. Кароткінай, «Арнамент Полацкага храма» Дзм. Лыбіна, «Шляхам аршанскіх рыцараў» В. Войціка, «Спевы даўнейшых ліцвінаў» В. Кузняцова).

Пры разнастайнасці індывідуальна-аўтарскіх стыляў агульнымі для кампазітараў Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы паўсталі: апора на два творчых кірункі – рэканструктыўны і «гістарычную інверсію» (М. Бахцін) [1], а таксама і выразнае маркіраванне эпохі Сярэдніх вякоў праз шматлікія музычныя і па-замузычныя інтэртэкстуальныя сувязі, мастацкія топасы, сімвалы (сапраўдны музычны матэрыял Сярэдневякоўя і яго стылізацыя, вербальныя адсылкі да далёкай эпохі, выкарыстанне старажытных музычных жанраў). Адметныя моманты вызначылі пралангацыю розных традыцый царкоўнай культуры (каталіцкай і праваслаўнай) і звароты да розных сюжэтаў і тэм з гісторыі.

Спецыфіку адлюстравання культурнага дыялогу сучаснасці і сярэдневяковай старажытнасці ў творах беларускіх кампазітараў склалі: арыентацыя на «нацыянальна-рамантычную» (Р. Сергіенка) [5] плынь пры разнастайнасці творчых рашэнняў вобразаў Сярэдневякоўя (аспект зместу, стылю, кампазітарскай ідыёлексікі); праграмнасць твораў, дзе вядучае месца належыць тэмам і сюжэтам з гісторыі беларускай гісторыі; пераважная апора на падыход «гістарычнай інверсіі» (недакладна-гістарычнае, паэтызаванае і суб'ектыўна-рамантызаванае ўяўленне мінуўшчыны); насычэнне музычных тэкстаў ментальна знакавымі і значнымі інтэртэкстуальнымі перакрыжаваннямі (узровень: музыка – выява – слова - дзеянне), а таксама мастацкімі топасамі (музычна-стылёвымі, жанравымі, вербальнымі).

Такім чынам, актуальная для мастацкай культуры тэндэнцыя звароту да вобазнага свету і духоўных дамінант эпохі Сярэдневякоўя знайшла шматграннае ўвасабленне ў творчасці ўсходнееўрапейскіх, у тым ліку і беларускіх кампазітараў XX ст. Пры пэўных паралелях, музыка айчынных аўтараў вылучаецца адметным падыходам да творчай трактоўкі тэмы Сярэдніх вякоў і яе музычным ўвасабленнем.


1. Бахтин, М. Эстетика словесного творчества / М. Бахтин // Библиотека научной и учебной литературы [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.sbiblio.com/biblio/archive/bahtin_estetika/. – Дата доступа : 15.06.2012.

2. Гуревич, А. Я. Проблемы средневековой народной культуры / А. Я. Гуревич. – М. : Искусство, 1981. – 357 с.

3. Дадзіёмава, В. Ул. Разлом эпох у гісторыі музычнай культуры Беларусі: міфы і рэаліі / В. Ул. Дадзіёмава // Музычная культура Беларусі на скрыжаванні эпох: навук. працы




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускай дзяржаўннай акадэміі музыкі; склад. Т. Якіменка. – Вып. 26. – Мінск : Беларус. дзярж. акад. музыкі, 2011. – С. 198–203.
4. Катунян, М. «Новое сакральное пространство» Владимира Мартынова / М. Катунян. - // Русское музыкальное общество [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.irms.ru/martynov02.html. - Дата доступа : 18.05.2014.
5. Сергиенко, Р. И. Особенности историко-стилевого процесса развития белорусской музыки во второй половине XX века / Р. И. Сергиенко // Проблемы славянской культуры и цивилизации: материалы XI Международной науч.-методич. конф., посвящ. 100-летию пед. образов. на Дальнем Востоке и 55-летию Уссур. гос. пед. инст., Уссурийск, 21 мая 2009 г. / УГПИ; редкол. С. А. Калмыкова [и др.]. – Усурийск, 2009. – С. 218–272.

# СПЕЦИФИКА ВЗАИМОДЕЙСТВИЯ КИТАЙСКИХ И ЕВРОПЕЙСКИХ МУЗЫКАЛЬНЫХ ТРАДИЦИЙ В ОРАТОРИИ ХУАН ЦЗЫ «ВЕЧНАЯ ПЕЧАЛЬ»

**Цзинь Фонлинь**
*преподаватель кафедры искусства вокала факультета музыки и хореографии Чжэнчжоуского педагогического университета (г. Чжэнчжоу, КНР)*

***Аннотация.*** *Статья посвящена исследованию особенностей взаимодействия китайских национальных и европейских музыкальных традиций на примере оратории Хуан Цзы «Вечная печаль». Реальные исторические события, запечатленные в поэзии Вэй Ханьчжана, наполненной метафорами и символами, и переосмысленные в контексте современных проблем, стали основой оратории. Сочетание традиционного китайского музыкального языка (мелодии, ритма, фактуры) с классической европейской формой оратории сделали произведение Хуан Цзы одним из самых известных в китайской музыке.*

***Summary.*** *The article is devoted to the study of interaction feature of the Chinese national and European musical traditions on the example of oratorio Huan Tszy «Eternal Sorrow». Real historical events, captured in poetry Wei Han-zhang, full of metaphors and symbols, and reinterpreted in the context of contemporary problems, became the foundation of the oratorio. The combination of traditional Chinese musical language (melody, rhythm, texture) with classic European form oratorio work done Huan Tszy one of the most famous Chinese music.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В истории китайского музыкального искусства творчеству Хуан Цзы (1904–1938) принадлежит особое место. Успешный композитор, музыкальный теоретик и педагог с многосторонними способностями он внес большой вклад в музыкальную культуру Китая. За свою недолгую жизнь он успел создать выдающиеся произведения вокальной и инструментальной музыки. Наибольшую известность получили оркестровая музыка «Фантазия городского пейзажа», оратория «Вечная печаль», хоры «Против врага», «Флаг развевается», песни «Тоска по родине», «Цветок – не цветок», «Роза несколько раз жаловалась» и т.п.

Одно из самых ярких своих произведений – ораторию «Вечная печаль» Хуан Цзы написал в содружестве с поэтом Вэй Ханьчжаном (1905–1993). Известный автор песен, активный пропагандист современной китайской музыки Вэй Ханьчжан совместно с Хуан Цзы создал 13 вокальных произведений, в том числе «Флаг развевается», «Прощание», «Против врага», а также ораторию «Вечная печаль».

Оратория «Вечная печаль», написанная в 1933 году в период японской агрессии и обострения антияпонских настроений в обществе, явилась первым китайским